УДК 821.161.3:82-343

**А. С. Гушча**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ЖАНР КАЗКІ Ў ТВОРАХ ПЯТРА ВАСЮЧЭНКІ («ЖЫЛІ-БЫЛІ ПАНЫ КУБЛІЦКІ ДЫ ЗАБЛОЦКІ»)

**Уводзіны.** Казка — гэта скарбніца народнай мудрасці, якая дапамагае чалавеку лягчэй пераадолець непазбежныя крызісы ў жыцці. Яна ўводзіць чытача ў кола незвычайных падзей, што адбываюцца з героямі, выказвае глыбокія маральныя ідэі, выяўляе высокія пачуцці і памкненні чалавека. Спецыялісты ў галіне дашкольнай адукацыі, настаўнікі, педагогі-псіхолагі імкнуцца выкарыстоўваць у сваёй працы эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне казак. Іх каштоўнасць заключаецца ў адсутнасці ўзроставых абмежаванняў для чытання, у магчымасцях асобаснага развіцця не толькі дашкольнікаў, малодшых школьнікаў, але і падлеткаў, дарослых людзей. У педагагічнай практыцы сустракаецца нават такое паняцце, як «казкатэрапія».

Сучасныя пісьменнікі (Раіса Баравікова, Міхаіл Сенюк, Георгій Марчук і інш.) даволі актыўна распрацоўваюць жанр казкі. Адным з найбольш цікавых і яркіх прыкладаў увасаблення жанравых асаблівасцей казкі ў сучаснай літаратуры з’яўляецца твор Пятра Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі», які складаецца з дзвюх казачных аповесцей.

**Асноўная частка.** Пятро Васючэнка — вядомы беларускі літаратуразнавец, крытык, празаік, драматург, эсэіст, казачнік, аўтар фэнтэзі і дзіцячы пісьменнік. Аматарам казак прызначана яго кніга «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» (1997), а таксама п’есы-казкі «Страшны Гам», «Новы калабок». Творамі для дзяцей Пятро Васючэнка «ўнёс свежы струмень у казачную плынь сучаснай беларускай літаратуры» [1, с. 123].

Кніга Пятра Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» спалучае рысы авантурных, чарадзейных, сацыяльна-бытавых казак і казак пра жывёл. Літаратурная казка, паводле меркавання даследчыкаў, «грунтуецца на выкарыстанні жанравых асаблівасцей народных казак, але мае адметнае аўтарскае асэнсаванне свету» [2, с. 606]. У творы Пятра Васючэнкі паказваецца даволі незвычайнае і насычанае прыгодамі жыццё паноў Кубліцкага і Заблоцкага, якія лічаць сябе сапраўднымі шляхціцамі сармацкага паходжання.

Сюжэт твора пачынаецца з паказу мінулага паноў — іх заможнага жыцця. З-за ўласнай прагавітасці і недарэчнасці Кубліцкі і Заблоцкі пазбавіліся ўсёй маёмасці, засталася толькі ўбогая хаціна, партрэты продкаў ды невялічкая дзялянка рэпы на агародзе: «Пан Кубліцкі на сняданак, бывала, аплятаў засмажанага вепрука. Пан Заблоцкі адным махам мог выпіць цэлую барылу мёду. Нядзіўна, што гаспадарка ў абодвух звялася на нішто. Гаёк, палеткі, паша, каровы, свінні, птаства — усё ляснула з-за вялікай панскай ахвоты да яды. Засталася на дваіх адна ўбогая хаціна, у падполлі — вецер ды галодныя мышы» [3, с. 154].

Кніга «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» мае таксама рысы чарадзейнай казкі, у якой абавязкова дзейнічаюць незвычайныя героі або іх дзіўныя памочнікі. Казачная фантастыка стварае свой непаўторны свет, у якім, як і ў сапраўдным жыцці, змагаюцца сілы дабра і зла, але заўсёды перамагае справядлівасць. Чарадзейныя казкі заснаваны на ўвасабленні цудадзейнага; у той жа час у такіх казках фантастычнае спалучаецца з рэальным [4, с. 325]. Яркім прыкладам увасаблення ў творы жанравых асаблівасцей чарадзейнай казкі з’яўляецца эпізод, калі паны даюць парады Куры-Шчабятуры наконт таго, якое кураня яна павінна вывесці:

«— А ў кураняці будуць усяго дзве ножкі? — трывожыцца пан Кубліцкі. — А ці можна, пані кура, каб адразу чатыры нагі?
— Сорак, сорак, — сіпіць пан Заблоцкі. — Падавай нам кураня-сараканожку.
— Можна і гэта, — згаджаецца Кура.
Але пану Заблоцкаму ніяк не ўладзіш.
— Каб і сала было на ім у далоню таўшчынёй! А ростам каб была з быка! Во!» [3, с. 169].

У выніку «перамоў» з Курай-Шчабятурай пыхлівыя і сквапныя паны атрымліваюць яйка, з якога вылупляецца «страхапуд», дзіўная фантастычная істота: «Але вось у яйку нешта грукоча, нешта стукоча, як у малатарні, асыпаецца шалупінне — і перад панамі з’яўляецца куранятка. Няможна апісаць, што гэта быў за страхапуд. Гара гарою, наперадзе бычыныя рогі і свінячы лыч, назаду хвост, як у пеўня. Яно рохкае немым голасам, тады лопае скрыдламі — і паны валяцца на зямлю як падкошаныя» [3, с. 169].

Кніга Пятра Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» выяўляе таксама жанравыя асаблівасці казак пра жывёл. Іх галоўнымі персанажамі, як правіла, з’яўляюцца жывыя істоты, птушкі, расліны, якія надзяляюцца тыповымі рысамі чалавечага характару (хітрасць, мудрасць і інш.) [4, с. 33]. Самым цікавым персанажам у творы, на наш погляд, з’яўляецца кот Буркун. У казцы ён паказваецца

© Гушча А. С., 2018



Рэпазіторый БарДУ

як гуманіст і ваявода, які адмаўляецца лавіць і есці мышэй, а збірае з іх войска і камандуе ім: «— Не хачу мышэй лавіць… Не буду сырых мышэй есці… I таксама вараных не буду есці, і пажараных не буду, і салёных, і мачоных не буду. Ніякіх не буду…, таму што мне іх шкада. Адным словам, кот быў гуманіст» [3, с. 210].

Вобразката персаніфікуецца, яму надаецца чалавечае пачуццё — каханне: «Буркун толькі зірнуў у вузенькае акенца з гарышча, пабачыў маленькую рыжанькую котку ўнізе, на бервяне — і дрыгнула катова сэрца. Кот закахаўся» [3, с. 213]. Кот пачынае спяваць, як чалавек: «Кот бярэ ў лапы мандаліну й пачынае спяваць раманс — самы што ні на ёсць пранікнёны раманс у свеце» [3, с. 213].

Сацыяльна-бытавыя казкі, рысы якіх прысутнічаюць у творы П. Васючэнкі, вызначаюцца вострым сацыяльным зместам. Іх герой — бедны селянін, работнік ці салдат, з якім здараюцца незвычайныя прыгоды. У сацыяльна-бытавых казках персанаж сутыкаецца са складанымі жыццёвымі абставінамі, з іх ён выходзіць жывым дзякуючы нечаканаму шчасліваму павароту падзей [5, с. 34]. У сацыяльна-бытавых казках «простыя» людзі перамагаюць паноў, багацеяў дзякуючы розуму і вынаходлівасці. Кубліцкі і Заблоцкі выяўляюць тыповыя рысы вобраза пана з народных казак. Яны не любяць працаваць, але прэтэндуюць на ўсе жыццёвыя выгоды. Калі Кубліцкаму і Заблоцкаму спатрэбіліся грошы, яны пайшлі ў заробкі. Спачатку паны вырашылі, што будуць пасвіць свіней, але ў іх нічога не атрымалася: «Пачухаліся паны ды вырашылі: свінні пасвіць. Усё-ткі нешта роднае, жывое. Але свінні не зважаюць на шляхетнасць сваіх пастухоў і разбягаюцца па лясах, хаваюцца ў пушчы. Тым часам свінні жыруюць на лясным харчы — жалудах ды карэньчыках — і памалу дзічэюць, абрастаюць шчаціннем» [3, с. 170].

Такая ж няўдача напаткала паноў і з каровамі, і з гусямі: «Каровы тым часам залазяць у грады і трушчаць усё чыста — моркву, рэпу, агуркі» [3, с. 170]; «нарэшце гусям надакучваюць такія вартаўнікі, яны выпростваюць рылы ды ўздымаюцца ў паветра, а паны, адвесіўшы губы, збянтэжана праводзяць іх вачыма» [3, с. 171]. Аўтар паказвае непрыстасаванасць паноў да жыцця, іх няўменне і нежаданне працаваць.

Кубліцкі і Заблоцкі засталіся без свайго багацця і апынуліся ў бядноце, але сваёй панскай натуры не страцілі. Яны хацелі, каб на іх хто-небудзь працаваў, гатаваў смачную ежу, прыбіраў пакоі, у час гульні ў карты адганяў мух: «Паны гуляюць у карты: у “воза”, у “курыцу”, у “дурня”, але ім дужа назаляюць мухі. Абседзелі ўсю стольˈ, сцены, пачалі падбірацца нават да лысіны пана Заблоцкага.

— Гэта самае, — задуменна кажа пан Кубліцкі, — трэба наняць служку, каб мух адганяла.

— Яшчэ каб поліўку варыла ды чыгун мыла, — дадае пан Заблоцкі» [3, с. 157].

Панскай служкай становіцца Дрыпа — маладзенькая дзяўчына, пяшчотная, летуценная асоба і фантазёрка, у якой, аднак, ёсць адна асаблівасць. Часам Дрыпа робіць тое, што «зойдзе ёй у галаву»: «Адно каб паны потым не шкадавалі. Бо ў мяне ў галаве, ведаеце, фантазіі розныя, лятункі…

— Якія яшчэ лятункі? — рагочуць паны.

— Якія, якія… Усялякія. От як стрэльне што ў голаў, дык усё раблю па-свойму. Натура такая» [3, с. 157].

Дрыпа — наіўная дзяўчына. Яна паверыла цыганцы, якая нагадала, што Дрыпа выйдзе замуж за цара: «Чакае цябе, красуня, далёкая дарога й вялікія турботы. Але дарма, бо пойдзеш замуж за цара Максімільяна» [3, с. 162]. Пасля гэтага здарэння Дрыпа ўцякае ад паноў шукаць цара Максімільяна. Дзяўчына перахітрыла паноў, якія разлічвалі на яе дбайную службу ў гаспадарцы.

**Заключэнне.** Па сваім змесце кніга Пятра Васючэнкі «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі» камічная і філасофская. Яна дазваляе асэнсаваць ідэю нелагічнасці празмерных людскіх жаданняў на прыкладзе жыцця паноў. Твор спалучае жанравыя асаблівасці авантурных, сацыяльна-бытавых, чарадзейных казак і казак пра жывёл.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск : Выш. шк., 2003. — 123 с.
2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн., 2005. — Т. 1. А—К. — С. 606—609.
3. Дзікі голуб : зб. сучас. беларус. прозы і крытыкі / уклад. Мікола Мінзер. — Мінск : Літ. і Маст., 2011. — С. 146—230.
4. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / склад. М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — 2-е выд. перапрац. і дап. — Мінск : Выш. шк., 2003. — С. 33—34.
5. Беларуская вусна-паэтычная творчасць : падручнік / К. П. Кабашнікаў [і інш.]. — Мінск : Лексіс, 2000. — 325 с.


Рэпазіторый БарДУ